звяры, якіх мог знайсці чалавек, упалявацъ, злавіць у сілкі, дапамагалі.выжыць. Тут, у такой сітуацыі, чалавек адчуваў сапраўдную ролю свайго зялёнага сябра, па-новаму ўспрымаў значэнне лесу, бо, не сакрэт, што калі не было пільнай парэбы, дык многае магло і забыцца ад першапачатковага ўяўлення пра пушчу. Для чалавека гэта характэрна, што пра нешта важнае пры наяўнасці менш значнага, можа проста не памятаць, "абыходзіцца без яго". У такіх выпадках аднаўлялася чысціня, натуральнасць узаемаадносін нашага продка і лясоў. Можна па-рознаму тлумачыць гэтую сувязь (падавацъ яе), але яна як была, так і ёсць, так і будзе. Лес абавязкова падтрымае, "У нас былі на тыя часы, ў каморы ў таку хоць нейкія запасы, маглі падацца, зрэшты, стрэльбу ўзяўшы, ў бор" (87).

Ацэньваючы ў цэлым ролю "Паляўнічых акварэлькаў з Палесся" Я.Лучыны для тагачаснай беларускай літаратуры, ды і для сучаснай таксама, абавязкова адзначым, што гэтак хораша, азартна, з веданнем справы і падрабязнасцей гэтага рамяства ні да яго, ні пасля яго ніхто не перадаваў у мастацкім творы. Паэт здолеў данесці, раскрыць унутраны свет палешука, паказаць наколькі цесна гэты чалавек быў злучаны з прыродай, як тонка ён яе адчуваў і што нават не ўяўляў свайго далейшага жыцця без яе існавання.

УДК 801.731

***Пікула Л.У.***

# АСЭНСАВАННЕ ВЕРША "VITA BREVIS. PATRIA ETERNIS" НІНЫ МАЦЯШ

Пажадаў дабра мне друг зычлівы.
Добра мне.
Дзень, адмалку на журбу ўрадлівы,
У цане.

Ах, не час валошкавы мой тае –
То пылок
З трапятлівых крыльцаў асыпае
Матылёк!..

Vita brevis. Patria eternis.

Зорны цвет
Чалавечых дум аб шляху ў цернях,
Запавет.

Як не выйду больш на васільковы
Я парог –
Пагукай безмежжа гэтых словаў
Чатырох...

1989



Паэзія Ніны Мацяш – неацэнны скарб нацыянальнай культуры, духоўных, маральна-этычных каштоўнасцяў. Ствараючыся ў духоўных вымярэннях, паэтычны свет набывае духоўна-чалавечы змест. Таму яе вершаванае слова абуджае думку, пабуджае разам з лірычнай гераіняй весці пошукі маральнай ісціны, далучацца да народнага вопыту, пераадольваць недасканаласць.

"Філасофскі падыход да жыцця, філасофскае асэнсаванне рэчаіснасці – гэта ў большай ці меншай ступені ўласціва любому пісьменніку, які творыць па ўнутранай неабходнасці, душой і сэрцам. Філасофскі роздум уласцівы таксама людзям, якія сутыкаюцца з сапраўднымі праблемамі, з сапраўднай жыццёвай драмай, людзям, якія на самой справе пакутуюць і перажываюць. Пісьменнік - філосаф – гэта, як правіла, у нечым няшчасны чалавек. "[1, ст.6].

Лірызм паэзіі Н. Мацяш мае драматычны характар. Адчуваецца, што да канца зведана, перажыта тое, пра што напісана. Творы паэтэсы кранаюць "натуральнасцю душэўнай страсці, яе нявымучанасцю ва ўгоду фармальным кампанентам верша."[2, ст.30].

"Я ніколі не вытузваю з сябе вершы, я іх проста чакаю", [3, ст.3] – прызнаецца Мацяш. А чытач ці сінхронна з аўтарам перажывае змест, ці, што здараецца, відаць, часцей, разумее выкладзеныя мастаком слова думкі ў адпаведнасці са сваім уласным вопытам.

Думаецца, аўтар, калі творыць, не заўсёды здагадваецца, які ідэйны змест, падтэкст, галоўную думку вылучыць крытык у яго творы, але прапануем сваё асэнсаванне аднаго з вершаў.

Адметнае месца ў лірыцы Ніны Мацяш займае верш "Vita brevis. Patria eternis". Своеасаблівую функцыю выконвае назва, якую варта ўмоўна назваць ідэйным цэнтрам твора. Vita brevis. Patria eternis – Жыццё кароткае. Радзіма вечная. Гэты лацінскі афарызм пакладзены ў аснову верша Ніны Мацяш. Вечныя пытанні быцця з'яўляюцца важнымі для лірычнай гераіні. На нашу думку, фундаментам жыцця яна называе вернасць Радзіме. Гераіня (на наш погляд – сама аўтарка), на лёс якой выпалі пакуты, выпрацоўвае свае жыццёвыя ідэалы, што існуюць у свеце здаўна. Нездарма выказаны яны не на роднай паэтцы беларускай мове, а на адной з самых старажытных моў свету– лацінскай, – што сведчыць пра даўняе існаванне гэтага афарызма, пра тое, што сама паэтка – не першапраходца ў гэтым сэнсе, а толькі праз сваю прызму бачання сцвярджае спрадвечныя ісціны. Яна адна з многіх. Толькі пясчынка ў моры такіх жа маленькіх, як і сама. Але маленькая толькі ў параўнанні з даўнімі ісцінамі, якія пераходзяць з аднаго пакалення ў другое, нягледзячы на рух часу.

***Пікула Людміла Уладзіміраўна**, выкладчык кафедры замежных моў эканамічных спецыяльнасцей Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта.*
*Беларусь, БДТУ, 224017, г.Брэст, вул. Маскоўская, 267.*

Не кожнаму выпадае шчасце зразумець тое, што не падлягае сумненню. У Мацяш жа "самае патаемнае ляжыць на паверхні і на самыя складаныя пытанні знаходзяцца простыя адказы, якіх чалавек часам не бачыць і не чуе".[4, ст.17]

Усведамленне многіх жыццёвых ісцін праяўляецца праз штодзённае. Рэчы, здавалася б, звычайныя, могуць адгукнуцца ў паэтычнай душы, а пачуцці – выліцца ў філасофскія радкі, над якімі нельга не задумацца: *Пажадаў дабра мне друг зычлівы./ Добра мне.*[5, ст.238]. Два сказы, два радкі – а колькі сказана! Ужо адно тое, што чалавек пажадаў дабра, можа ўзняць лірычнай гераіні настрой. Але і чалавек гэты ў Мацяш – асоба. Вобраз яго паэтка выпісвае двума словамі "друг зычлівы". Гэта друг. Але дзякуючы інверсіі разумеем, што сэнсавую нагрузку нясе прыметнік зычлівы. Калі пажадаюць дабра, хочацца ўсміхнуцца, шчыра падзякваць. Гэта вонкава. А ў душы – *Добра мне.* Безасабовы сказ дапамагае выявіць стан лірычнай гераіні, а адасабленне яго ў асобным радку выдзяляе сказ у кантэксце, прымушае задумацца, што добрыя ўчынкі, шчырыя словы могуць сагрэць душу. І тым больш таму, хто ў гэтым мае патрэбу.

Калі наша думка правільная і лірычным героем верша з'яўляецца сама аўтарка, то становіцца зразумелым сэнс фразы: *Дзень, адмалку на журбу ўрадлівы,/У цане.* Так, як і душэўную спагаду, яна цэніць і час. Здавалася б, дзень – гэта так мала, прайшоў, і няма яго. Але "*дзень ... у цане*". Несумненна, гераіня ведае цану часу, нават і "*ўрадліваму на журбу*". Хоць і напоўнены ён пачуццём смутку, але ж гэта – каштоўнасць, таму што многае можна зрабіць нават і за адзін дзень. Вось і трэба паспець гэта зрабіць, бо жыццё незаўважна праходзіць крок за крокам, хвіліна за хвілінаю. У пэўны момант лірычная гераіня заўважае гэтую яго хуткаплыннасць і пужаецца: *Ах, не час валошкавы мой тае...*, не маладосць сыходзіць, не жыццё.

Тут спынімся, задумаемся над значэннем у кантэксце словазлучэння "час валошкавы".

Адным з нязменных вобразаў паэтычнага свету Ніны Мацяш з'яўляецца валошка. У вершаваных творах "прыродныя замалёўкі не адасобленыя, а ў паралелях з апісаннем душэўнага і эмацыйнага стану чалавека. Прыродныя з'явы выступаюць скразнымі вобразамі яе лірычных твораў, падкрэсліваючы частую адпаведнасць настрояў гераіняў твораў прыродным зменам."[4, ст.15]

Думаецца, аўтарскі афарызм "час валошкавы" ў аналізуемым вер-шы – гэта і тое кароткае жыццё васілька сярод жыта, якому наканавана памерці тады, калі лёс вырашыць, і таксама жыццё кволай, пяшчотнай чалавечай душы.

На першы ж план выходзіць галоўнае – адмаўленне, нязгода лірычнай гераіні: *...не час валошкавы мой тае.* І як нечаканае рашэнне, праз працяжнік,- *То пылок /З трапятлівых крыльцаў асыпае /Матылёк!..*

Сумненне ў разважаннях выражаецца шматкроп'ем. Гэта не выйсце з рэальнасці. Навошта адмаўляць тое, што ёсць? Жыццё не стаіць на месцы. Час ідзе хутка, няспынна. Чалавек сталы ўжо задумваецца над вечнымі каштоўнасцямі, а мудры яшчэ і не шкадуе жыцця, ведаючы, што і пасля яго фізічнай смерці Зямля не спыніць свой рух, застанецца вечны кругазварот, застанецца і Радзіма. Жыццё кароткае. Радзіма вечная. І трэба штосьці пасля сябе пакінуць Радзіме, нашчадкам. *Зорны цвет / Чалавечых дум аб шляху ў цернях, /Запавет.*

Такой духоўнай спадчынай можа стаць паэзія, "бо тыя вобразы, якія мы ствараем, існуюць не толькі на паперы, але жывуць і ў тонкім свеце,"[6, ст.4] – гаворыць паэтка.

"Зорны цвет чалавечых дум" – гэта россып слоў на чыстым аркушы, гэта пошукі ісціны чалавекам, адлюстраваныя на паперы. І гэта не проста думы, а думы "аб шляху ў цернях". А значыць няпростыя пошукі няпростых адказаў.

Канва верша ясная: у ім лірычная гераіня спрабуе знайсці (і знаходзіць) адказ на адвечнае пытанне – у чым сэнс чалавечага жыцця? У невялікім па памеры лірычным творы паэтка здолела праз душэўныя перажыванні сваёй лірычнай гераіні раскрыць сэнс афарызма, вобразна перадаць "адчуванне бясконцасці і разнастайнасці жыцця нават у межах чалавечага лёсу".[2, ст.30] Гэтае адчуванне выразна акрэслена ў апошнім сказе, які гучыць запаветам: *Як не выйду больш на васількова /Я парог – / Пагукай бязмежжа гэтых словаў /Чатырох...*

Калі не стане чалавека, застанецца яго Радзіма. Успомні аб гэтым і не сумуй. Хто жыў дзеля Радзімы, той зрабіў для яе ўсё, што змог. Азірніся, задумайся. Vita brevis – Жыццё кароткае. Patria eternis – Радзіма вечная. Думай аб вечным і жыві дзеля яго.


### СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Дзянісава Н. Аптымісты пішуць кепска // ЛіМ. - 2004. - № 12.- ст 6.
2. Тарасюк Л. Непадзельнасць // Роднае слова. - 1993. -№ 9. - ст 29-31.
3. Падаляк Т. "Хай жураўлём абернецца сініца..." Доля і шчасце паэткі Ніны Мацяш // Звязда. - 1999.-25 жніўня .- ст 3.
4. Калядка С. Вернасць радасці // Роднае слова. - 2002. - № 3.
5. Мацяш Н. Паміж ўмешкай і слязой. Вершы і паэмы(1962-1992) / Прадм. У. Калесніка. - Мн.:"Мастацкая літаратура", 1993.
6. Чэмер М. Вобразы, якія мы ствараем, жывуць у тонкім свеце // Настаўніцкая газета. - 2003. - 23 верасня. - ст. 4.


УДК 82:1

***Столярчук С.П.***

# ПРОБЛЕМА ПРЕЕМСТВЕННОСТИ НРАВСТВЕННО-ЭСТЕТИЧЕСКИХ КОНЦЕПТОВ В ТВОРЧЕСТВЕ И.А. БРОДСКОГО ОТНОСИТЕЛЬНО ПАРАДИГМЫ РАЗВИТИЯ РУССКОЙ СЕМАНТИЧЕСКОЙ ПОЭТИКИ

Общее место исследовательских заключений о творчестве И. А. Бродского – признание за ним роли некоего масштабного «завершителя» русской поэзии, что порождает больше вопросов, чем ответов на них. «Эпилогичность» Бродского, несомненно, возникла в определенных исторических обстоятельствах и в силу объективных причин, но, с другой стороны, явилась результатом настойчивого осмысления собственной Судьбы Поэта – навстречу обстоятельствам поднялась мощная биографическая и автобиографическая легенда, также получившая по отношению к русской поэтической культуре «завершающий характер. Единство этих двух планов создаёт особые трудности при попытках вписать творчество Бродского в контекст историко-литературной традиции: влияний, перекличек и параллелей оказывается избыточно много, и подобная мозаика всегда готова рассыпаться в полном беспорядке. Весьма многозначителен и ответ самого поэта на вопрос о влияниях: «Навалом… и ни одного».

Однако так мы рискуем удалиться от самого смысла понятия традиции как выбора художественных возможностей, заложенных в опыте предшествующей литературы, когда

***Столярчук С.П.****, ассистент кафедры классической и современной зарубежной филологии Брестского государственного университета имени А.С. Пушкина.*
*Беларусь, БрГУ, 224665, г. Брест, ул. Советская, 8.*